# ПАЛІТРА ПАЧУЦЦЯЎ

## Чэшскія колеры расійскага мастака душой і сэрцам прыгарнуліся да Беларусі

**Мастацкі свет заўсёды непрадказальны. Мастакі здаўна падарожнічаюць, шукаючы новых уражанняў. Невыпадкова передзвіжнікі ехалі на доўгія вакацыі ў Еўропу. Як невыпадковым здаецца жаданне, напрыклад, Георгія Паплаўскага адкрываць Індыю, Кітай, Егіпет... Нават Кітай, у якім ужо можна стварыць мастацка-геаграфічны атлас беларускай скульптуры, вабіць шукальнікаў мастацкіх ісцін. Альбо ўражлівым падаецца «наступ» сучасных беларускіх мастакоў на Германію, Францыю, іншыя краіны. У 1960-я і пазней савецкія мастакі (былі сярод іх і прадстаўнікі беларускай мастацкай школы, як сённяя славуты жывапісец Барыс Забораў, якому ў Мінску цесна было ўседзець у «пасадзе» кніжнага графіка) імкнуліся вырвацца на вольнае паветра ў іншы свет. З кагорты такіх па-свойму рашучых і адважных і санкт-пецярбургскі творца Барыс Кюленен.**



Фота Наталлі АСМОЛЫ.

Атрымаўшы адукацыю ў Маскоўскім паліграфічным інстытуце, ён працаваў рэстаўратарам у Ленінградзе. Вядома ж, для поўнай яго рэалізацыі як мастака шмат чаго не ставала. Было жаданне вырвацца «за рамкі». Паспрыяла гэтаму і нечаканае каханне. У горад на Няве прыехала чэшская мастачка Бажэна Двожакава. Яна марыла пабываць у Эрмітажы. Але трапіла да гэтай скарбніцы ў выхадны дзень. На працу ішоў Барыс і сустрэўся позіркам з сумнымі вачыма замежнай госці. І не мог не правесці для яе экскурсію па пустых залах Эрмітажа. Так нарадзілася каханне. Усё адбылося імкліва. Бажэна развялася з мужам, запрасіла Барыса ў Чэхаславакію (так тады называлася яе краіна). Але... яго не выпусцілі. Бажэна правяла юрыдычна кансультацыі, раілася з натарыусам. І як вынік — яны распісаліся ў ЗАГСе ў Ленінградзе, а ў чэшскі Тржэбіц паехалі як муж і жонка. І быў гэта 1980 год...

Шчаслівыя сужэнцы Кюленены заснавалі мастацкую галерэю, на другім яе паверсе зрабілі жылыя пакоі. Шмат працавалі. Арганізоўвалі выстаўкі, ездзілі літаральна па ўсім свеце. Барыс Кюленен спраўдзіўся не толькі як рэстаўратар, але і як жывапісец, кніжны графік, фотамастак... Цяпер ён з ахвотай сваімі творамі вяртаецца ў знаёмую яму постсавецкую прастору. Так здарылася, што яго выстаўка графічных работ прайшла ў «Кніжным салоне» ў Мінску. Як куратар гэтага праекта і мінскі куратар чэшскай галерэі GalerieKARAS выступіла мастачка, кніжны графік Аксана Аракчэева. Сам аўтар работ не змог прыехаць з чэшскага Тржэбіча. Але яго віталі многія зацікаўленыя ў развіцці чэшска-беларускіх мастацкіх і культурных стасункаў асобы. І старшыня таварыства «Беларусь — Чэхія» Валерый Гедройц, і намеснік старшыні беларускага Саюза мастакоў Аляксандр Дранец, і паэт Сяргей Панізнік, даўні прыхільнік чэшскай культуры, перакладчык многіх твораў чэшскіх паэтаў на беларускую мову.

Усе яны праніклiва, з пачуццём асаблівай сардэчнасці гаварылі пра колеры, вынайдзеныя Барысам Кюлененам у расповедзе пра Чэхію, Маравію, Тржэбіч, розныя цікавыя яму тэмы. Палітрай пачуццяў я назваў бы ўсе мастацкія знаходкі чэшскага творцы. І хоць ён не прыехаў на імпрэзу ў «Кніжны салон», здавалася, што размову з гледачом вядуць яго душа і сэрца.

— У многім сённяшняя выстаўка адбылася дзякуючы руплівасці колішняга чэшскага пасла ў Беларусі Іржы Караса, які настойліва цяпер прапагандуе ў Чэхіі беларускае выяўленчае мастацтва, робіць цяснейшымі мастацкія сувязі дзвюх славянскіх краін. Дарэчы, напрыканцы сваёй дыпламатычнай місіі Іржы Карас у 2011 годзе быў выбраны ганаровым членам Беларускага саюза мастакоў. Такое званне прысуджана было ўпершыню. І цяпер добры сябар Беларусі не забывае пра сваю захопленасць творчымі адкрыццямі нашых жывапісцаў, графікаў. Сведчанне гэтаму і тое, што Galerie KARAS у 2013—2014 гг. правяла чатыры беларускія выстаўкі. А ў сёлетнім лістападзе яна прапаноўвае свае залы для вернісажа беларускіх скульптараў «Шляхам Скарыны да Прагі». Імпрэза ж у мінскім «Кніжным салоне» — адзін з першых крокаў да асваення чэшскага мастацкага свету ў Беларусі.

**Сяргей ШЫЧКО**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ЖЫЦЦЁ НАВЫВАРАТ

## З-за ўключанай на гаджэце камеры яно ў адзін момант можа стаць зусім не асабістым і далёка не прыватным

Студэнтка медкаледжа ў Казані прагнула славы — і яна яе займела. Праўда, падазраю, зусім не такую, аб якой марыла: яе выключылі з навучальнай установы, цяпер стаіць пытанне аб завядзенні на яе крымінальнай справы. Хаця ў нейкай ступені яна сваёй мэты дасягнула: у інтэрнэце на яе старонцы — тысячы праглядаў. Яно і не дзіва: дзяўчына выклала ў сацыяльнай сетцы фота з аперацыі, падчас якой яна была асістэнткай. Няспраўджаная медсястра вельмі дэталёва ў каментарыях апісала траўмы псіхічна хворай пацыенткі, якая выпала з акна шматпавярховага дома, а на фота пазіравала... з органамі гэтай самай пацыенткі ў руках.

Сюжэт — сапраўдная знаходка для журналістаў. Адны кінуліся ў той каледж, і зляканае кіраўніцтва рапартуе ў камеру, што ўсе будучыя медспецыялісты пройдуць псіхалагічнае тэсціраванне на прадмет выкавання элементарнай прафесійнай этыкі (цікава, як яны будуць высвятляць, гатовы санітар ці медсястра фатаграфавацца на фоне хворага або пакалечанага чалавека ці не?). Другія тыкаюць мікрафонам у твар праваабаронцам, і тыя з энтузіязмам тлумачаць, што чалавек за падобныя дзеянні павінен падвяргацца самаму сур'ёзнаму пакаранню. Трэція запрашаюць у студыю псіхолага, і той пераканаўча разважае аб праблемах, якія ў раннім дзяцінстве адбіліся на цяперашніх паводзінах той «зоркі» інтэрнэту.

Шчыра кажучы, з усіх эмоцый, якія прыйшлі ўслед за гэтай інфармацыяй, самай моцнай было, бадай што, не абурэнне. Яно, канешне, было, як, напэўна, і ў кожнага нармальнага чалавека, але вельмі хутка саступіла месца страху. Як той казаў, прэцэдэнт — і не адзінкавы, калі пагледзець на тое, што творыцца ў сусветнай смецніцы пад назвай «сацыяльныя сеткі», — меў месца. Гарантыі, што твой стаматолаг ці, выбачайце, дамскі доктар не акажацца маральным вычварэнцам, абдзеленым увагай, які хоча займець гэту самую ўвагу хай сабе хоць у віртуальным свеце, няма ніякай. Выходзіць, нават засынаючы пад наркозам, расслабляючыся на масажы ці прыходзячы на прымерку ў атэльe, трэба быць вельмі пільным, бо смартфон ці айфон у пакоі — павышаная небяспека для асабістага прыватнага жыцця, якое з-за ўключанай на гаджэце камеры ў адзін момант можа стаць зусім не асабістым і далёка не прыватным...

Пра мараль тут размову весці ўвогуле бессэнсоўна — глабальнае сеціва — тэрыторыя, вольная ад маралі. Гэтаксама як і пра адказнасць, фінансавую або крымінальную, вялікая верагоднасць якой можа прымусіць задумацца тых, хто спрабуе дзеля ўласнай аднамінутнай славы напаскудзіць іншаму. «Інтэрнэт — гэта як плот, на якім напісана непрыстойнае слова: усе, хто ідзе міма, чытаюць, але ніхто не ведае дакладна, хто яго напісаў»... Гэтыя словы я пачула гадоў пятнаццаць назад ад шаноўнага прафесара Ясера Засурскага, які ўжо тады, на світанку глабалізацыі інфармацыі разумеў і папярэджваў, што яна за сабой пацягне. Нічога не змянілася, толькі да слоў на «плоце» дабавіліся непрыстойныя карцінкі, аўтарства якіх вылічыць проста немагчыма. Калі, вядома, сам аўтар гэтага не пажадае...

Але ж жадаюць! Дзяўчына, што зладзіла фотасесію ў аперацыйнай, не ўтойвала свайго імя, наадварот — яна хацела сабраць як мага большую колькасць «лайкаў» на свае крывавыя здымкі. Гэткая віртуальная публічнасць характэрная больш для падлеткаў, абдзеленых увагай блізкіх людзей, гавораць псіхолагі. Вывернуць жыццё — сваё або чужое, не важна, — перад шматмільённай аўдыторыяй імкнуцца недалюбленыя ў сям'і дзеці, да якіх няма справы самым родным людзям. Але ж гэта робяць і разумныя дарослыя — і іх віртуальныя ўчынкі часам зусім нельга патлумачыць і зразумець. Спецыялісты-»мазгаведы» тут таксама катэгарычныя: гэтыя дзядзькі і цёткі, што прагнуць публічнасці, — тыя самыя недалюбленыя дзеці, якія проста выраслі.

У такім выпадку ёсць чаго баяцца нам усім. Бо хутка вырастуць нашы дзеці. Якім ужо ў паўтара-два гады, каб адчапіцца, уключаем камп'ютар ці планшэт — разумную тэхніку, што, на нашу радасць, вельмі добра спраўляецца з абавязкамі нянькі. (А калі задумацца — ньдрэнна замяняе і нас саміх.) З кім гэтыя дзеці будуць дзяліцца перажываннямі, горам, радасцю, назіраннямі — з татам і мамай, вечна занятымі сваімі справамі? Або з самым надзейным сябрам, які паказвае цікавыя мульцікі, спявае песні, расказвае казкі? У якім, як выявіцца крыху пазней, — мільён гэткіх самых сяброў, што шукаюць любові і ўвагі ў віртуальным свеце, не атрымаўшы гэтых простых рэчаў у рэальным...

...Нядаўна з прыяцелем пайшлі ў тэатр. Спектакль быў цікавы, пагаварыць пасля было пра што. Ды не ўдалося: выйшаўшы на вуліцу, ён адразу ўключыў планшэт і пачаў на сваёй віртуальнай старонцы пісаць паведамленне аб сваім культурным паходзе, уражанні, размяшчаць фота... На ўсе мае спробы загаварыць адмахваўся: пачакай, маўляў, гэта ж тэрмінова. Махнуўшы рукой, я пакінула яго сам-насам з любімым суразмоўцам (сумняваюся, што ён гэта заўважыў). Назаўтра ён пазваніў, прасіў прабачэння, запрашаў да сябе ў госці на келіх віна. Адмовілася: зусім не хачу, каб пра тое, якое мы пілі віно, даведаўся ўвесь свет.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# СВЕДЧАННЕ ПАМЯЦІ

## У Мінску падтрымалі ініцыятыву Еўразійскага збору артэфактаў Другой сусветнай

**Напярэдадні 70-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў беларускія распрацоўшчыкі папулярнай камп'ютарнай ваеннагістарычнай гульні «Свет танкаў» (World of Tanks) арганізавалі аўтапрабег «Уладзівасток (Расія) — Брэст (Францыя)». Галоўнай мэтай мерапрыемства стаў збор калекцыі экспанатаў часоў Другой сусветнай вайны. На гэтым тыдні ўдзельнікі аўтапрабегу спыніліся ў Беларусі.**

Аўтапрабег стартаваў 22 жніўня ва Уладзівастоку, і ўдзельнікі ўжо прарабілі шлях даўжынёй 13 000 км з Уладзівастока да Мінска і правялі ў дарозе больш за 40 дзён. Увесь маршрут аўтапрабегу будзе доўжыцца каля двух месяцаў і фінішуе ў французскім Брэсце. У рамках акцыі ўжо было арганізавана 18 сустрэч, на якія прыхільнікі World of Tanks і ўсе ахвотныя прынеслі больш за 50 адзінак памятных рэчаў ваеннай эпохі з асабістых архіваў — фотаздымкі, медалі, лісты або іншыя атрыбуты ваеннага побыту. Яны будуць перададзены ў ваенна-гістарычныя музеі. Вось некаторыя з гісторый з вуснаў удзельнікаў аўтапрабегу.

**Яўген Нігматулін (медаль «За ўзяцце Кёнігсберга», ордэн Айчыннай вайны другой ступені):**

*— Недалёка ад майго дома стаялі тры нежылыя драўляныя дамы, тры баракі. Потым два з іх знеслі, а адзін згарэў. Мне было гадоў дванаццаць, калі мы з сябрамі лазілі па гэтым пажарышчы, і там я знайшоў гэтыя ордэн і медаль. Я не ведаю, каму яны належалі, для мяне яны так і засталіся безыменнымі. Гэта было занадта даўно да мяне, каб высветліць, хто там жыў, і бацькі мае, і сваякі таксама не ведаюць. Але гэтыя ўзнагароды не мае, і я не маю права трымаць іх у сябе, хай яны захоўваюцца ў музеі.*

**Вадзім Кулакоў (медалі «За ўзяцце Берліна» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.»):**

*— Цапенка Мітрафан Васільевіч — мой прадзед па матчынай лініі, украінец. Ён пайшоў на фронт у 1941 годзе, быў кулямётчыкам, атрымаў раненне — прастрэлілі лёгкае. Потым павінны былі камісаваць, але ён прыняў рашэнне паехаць на Уралвагонзавод, дзе нароўні са звычайнымі слесарамі збіраў танкі Т-34. А потым на гэтых танках і пайшоў ваяваць зноў: былі створаны Уральскі добраахвотніцкі танкавы корпус. Ён дайшоў да Берліна, іх экіпаж браў Рэйхстаг. Я хачу, каб не толькі я глядзеў на гэтыя медалі, але і ўся краіна глядзела на іх і памятала сваіх герояў.*

**Сяргей Карпаў (кабура):**

*— Гэта нямецкая кабура 1943 года ад парабелума. Дасталася яна мне ад цесця: ён служыў у заходняй групе войскаў, і, відаць, яна трапіла яму ў рукі ў Германіі. Ён мне яе перадаў, а мне яна без патрэбы. Я вырашыў, што вам больш патрэбна — вы робіце добрую справу, і гэтая кабура яшчэ спатрэбіцца як экспанат у музеі (на шчасце, не па прамым прызначэнні).*





**Павел Хахракоў (медаль «За перамогу над Японіяй»):**

*— Медаль захоўваўся ў мяне дома. Мне здаецца, з рэчамі такое часта адбываецца: яна ў цябе ёсць, а адкуль, ты ўжо не памятаеш. Абодва мае прадзеды ваявалі ў Другую сусветную, а ў майго сябра захаваліся лісты, якія яго прадзед пісаў дадому. Я хачу перадаць медаль у музей — калі ён там будзе захоўвацца, то гэта будзе не баявая ўзнагарода, але сведчанне памяці. Вядома, хацелася б даведацца яе гісторыю, але гэта ўжо немагчыма...*

У кожным горадзе па маршруце аўтапрабегу яго ўдзельнікі праязджаюць на сустрэчу з распрацоўшчыкамі на асабістым аўто, пераробленым з падручных сродкаў у «танкамабіль». Мінск не стаў выключэннем.

Мерапрыемства было арганізавана ў рамках праграмы «Памятаем усё». Гэта глабальная ініцыятыва кампаніі Wargaming, якая была пачата ў канцы 2013 года і накіравана на садзейнічанне ваеннагістарычным музеям па ўсім свеце ў справе захавання і рэстаўрацыі легендарных узораў ваеннай тэхнікі. Кампанія павінна адрадзіць цікавасць да гісторыі, натхніць моладзь на вывучэнне мінулага сваёй краіны і захаваць для будучых пакаленняў унікальныя гістарычныя помнікі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**